# Паэзія як мова



Ёсць людзі, якія не могуць жыць без паэзіі. Менавіта да такіх натхнёных людзей адносіцца Ганна Крох. 23 верасня ў Мазырскай цэнтральнай бібліятэцы імя А.С. Пушкіна адбылася цікавая і задушэўная сустрэча творцы з пяцікласнікамі СШ № 7.

Ганна Віктараўна не прафесійная паэтка, але вельмі любіць пісаць вершы і стварае іх з чатырнаццаці гадоў. Паэзія – гэта яе мова, гэта яе душа. Яна з радасцю і задавальненнем дзялілася сваімі творамі з маленькімі слухачамі, якія з цікавасцю слухалі яе і задавалі даволі сур'ёзныя пытанні. Прыемна, што паэтычная сустрэча была прысвечаная Дню нашага роднага горада Мазыра.

Класны кіраўнік школьнікаў Таццяна Серада лічыць, што вельмі карысна для дзяцей наведваць творчыя сустрэчы, цікавыя імпрэзы, выставы. Вось і нядаўна дзеці пабывалі на сустрэчы з Таццянай Швед, акварэльныя працы якой экспанаваліся ў бібліятэчнай мастацкай галерэі «Зачараваныя родным краем». Ладзіць такія сустрэчы супрацоўнік сектара краязнаўства бібліятэкі Ніна Цюленева. Яе вельмі часта можна ўбачыць сярод школьнікаў, з якімі яна дзеліцца душэўнай шчодрасцю, таму маленькія наведнікі азвотна прыходзяць у бібліятэку.

Вось і зараз атрымалася поўная радасці і светлых уражанняў сустрэча з паэзіяй і проста з цікавым чалавекам, любіцелькай мастацкага слова Ганнай Крох. І нягледзячы на тое, што за вакном пахмурнае надвор'е не спрыяла настрою, у бібліятэчнай зале было ўзнёсла і ўтульна.

*Таццяна ПРАКОПЧАНКА,*
*г. Мазыр*